ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)В, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 20 (7097) | Нядзеля, 27 лютага 1944 г. | Цана 20 кап.

**„Калі Совецкі Саюз адзін на адзін не толькі вытрымаў націск германскай ваеннай машыны, але і нанёс нямецка-фашысцкім войскам рашаючыя паражэнні, то тым больш будзе безнадзейным становішча гітлераўскай Германіі, калі ўступяць у дзеянне галоўныя сілы нашых саюзнікаў і супроць гітлераўскай Германіі разгорнецца магутнае і нарастаючае наступленне армій усіх саюзных дзяржаў".**

(З загада таварыша Сталіна ад 23 лютага 1944 года).

## ЗАГАД

## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

### Генералу арміі ПАПОВУ

### Генералу арміі ГОВАРАВУ

Войскі 2-га Прыбалтыйскага фронта пры прамым садзеянні войск Ленінградскага фронта, развіваючы наступленне ў цяжкіх умовах лясіста-балоцістай мясцовасці, сёння, 24 лютага, у выніку імклівай атакі, авалодалі горадам і важным чыгуначным вузлом Дно—моцным апорным пунктам абароны немцаў на Пскоўскім напрамку.

У баях за авалоданне горадам Дно вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта Караткова, генерал-лейтэнанта Рагінскага, генерал-маёра Сцепаненка, генерал-маёра Раждзественскага, артылерысты генерал-маёра артылерыі Купрыянава, генерал-маёра артылерыі Петрапаўлаўскага, танкісты палкоўніка Пшэнецкага і палкоўніка Урбанава.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, найбольш вызначыўшыеся ў баях за вызваленне горада Дно, прадставіць да прысваення найменавання „Дноўскіх" і да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 24 лютага, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе нашым доблесным войскам, авалодаўшым горадам Дно,—дванаццацю артылерыйскімі залпамі з ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях за вызваленне горада Дно.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захватчыкам!

*Вярхоўны Галоўнакамандуючы*

*Маршал Совецкага Саюза*

*І. СТАЛІН.*

24 лютага 1944 года.

## ЗАГАД

## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

### Генералу арміі РАКАСОЎСКАМУ

Войскі 1-га Беларускага фронта, фарсіраваўшы раку Днепр, прарвалі моцную абарону немцаў на фронце 50 кіламетраў, прасунуліся ўперад за тры дні наступальных баёў на 20-25 кіламетраў і сёння, 24 лютага, штурмам авалодалі горадам і буйнай чыгуначнай станцыяй Рагачоў—важным апорным пунктам абароны немцаў на Бабруйскім напрамку.

У баях за авалоданне горадам Рагачоў вызначыліся войскі генерал-лейтэнанта Гарбатава, генерал-маёра Урбановіча, артылерысты генерал-лейтэнанта артылерыі Семёнава, танкісты падпалкоўніка Макарыкава, маёра Белякова, лётчыкі генерал-лейтэнанта авіяцыі Рудзенка і сапёры палкоўніка Воранава, маёра Кожына і капітана Шаферост.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, найбольш вызначыўшыеся ў баях за вызваленне горада Рагачоў, прадставіць да прысваення найменавання „Рагачоўскіх" і да ўзнагароды ордэнамі.

Сёння, 24 лютага, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 1-га Беларускага фронта, авалодаўшым горадам Рагачоў,—дванаццацю артылерыйскімі залпамі з ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях за вызваленне горада Рагачоў.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захватчыкам!

*Вярхоўны Галоўнакамандуючы*

*Маршал Совецкага Саюза*

*І. СТАЛІН.*

24 лютага 1944 года.

## Ад Совецкага Інформбюро

### З аператыўных зводак за 24, 25 і 26 лютага

На працягу 24 лютага на паўднёвы-захад і на поўдзень ад Стругі Красныя нашы войскі, прадаўжаючы наступленне, авалодалі раённым цэнтрам Ленінградскай вобласці Серодка, а таксама з баямі занялі больш 50 другіх населёных пунктаў, у тым ліку Баглíцы, Заходы, Мішаколь, Ерэхнова, Закрупічча, Пустое Лескова, Шчэглі, Малажані, Тужэрына, Перахожа, Радзежа, Маякова, Кочэрыцы і чыгуначныя станцыі Баравік, Серодкіна, Владзімірскі Лагер.

На паўднёвы-захад ад возера Ільмень войскі 2-га Прыбалтыйскага фронта пры прамым садзеянні войск Ленінградскага фронта, прадаўжаючы развіваць паспяховае наступленне, 24 лютага штурмам авалодалі горадам і буйным чыгуначным вузлом Дно, а таксама з баямі занялі больш 100 другіх населёных пунктаў, у тым ліку Вяззе, Варобіна, Верэцце, Опока, Вашкова, Сухарэва, Юркава, Бальшое Трэсна, Скугры, Галовіна, Чэрнёва, Севернае Усце, Остры Камень, Гародня, Бродкі і чыгуначную станцыю Вяззе.

На паўднёвы-захад ад горада Холм нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад і занялі больш 40 населёных пунктаў, у тым ліку Цэўло, Макарына, Віхрышча, Ямна, Юхава, Осінаўка, Карэлкі, Харайлава, Шэрыхова і чыгуначную станцыю Самалукава.

Днямі войскі 1-га Беларускага фронта перайшлі ў наступленне супроць нямецка-фашысцкіх войск, размешчаных у раёне Рагачоў. Паспяхова фарсіраваўшы раку Днепр, нашы войскі прарвалі вельмі ўмацаваную абарону праціўніка на фронце 50 кіламетраў, за тры дні напружаных баёў прасунуліся ўперад на 20-25 кіламетраў і 24 лютага штурмам авалодалі горадам і буйнай чыгуначнай станцыяй Рагачоў—важным апорным пунктам праціўніка на Бабруйскім напрамку, а таксама з баямі занялі больш 100 другіх населёных пунктаў, у тым ліку буйныя населёныя пункты Новы Быхаў, Лазарэвічы, Віляхоўка, Верхняя і Ніжняя Тошчыца, Кісцені, Вішчын, Дзедава, Еленава, Мадоры, Селец, Старое Сяло, Озеране, Бальшая і Малая Канапліца, Забарова, Турск, Хадасовічы, Цупер, Лугавая Варня, Калыбоўка і чыгуначную станцыю Тошчыца. Нашымі войскамі поўнасцю ліквідаван важны плацдарм немцаў на левым беразе Днепра на ўсход ад Рагачова і Жлобіна.

* * *

На працягу 25 лютага на паўднёвы-захад і на поўдзень ад Стругі Красныя нашы войскі, прадаўжаючы наступленне, авалодалі населёнымі пунктамі Мельніцы, Лутава, Плашчаны, Квашэнкіна Горка, Кебска, Горыста і чыгуначнай станцыяй Лапіна.

На захад і на поўдзень ад горада Дно нашы войскі прадаўжалі развіваць наступленне і авалодалі раённым цэнтрам Ленінградскай вобласці Дзедавічы, а таксама з баямі занялі больш 40 другіх населёных пунктаў, у тым ліку Борзіліцы, Ядрэева, Дзямянка, Шылінка Арбузава, Красная Острава, Заходы, Старыя Ліпкі, Ціманава, Сажына і чыгуначныя станцыі Бакач, Дзедавічы.

На захад і на паўднёвы-захад ад горада Холм нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад і занялі некалькі населёных пунктаў, у тым ліку Межнік, Барлаева, Навалокі, Ісакава, Дорка, Барадзіно, Кладавіцы.

На поўнач ад горада Рагачоў нашы войскі прадаўжалі весці наступальныя баі, у ходзе якіх занялі некалькі населёных пунктаў.

На другіх участках фронта дзеянні разведкі.

* * *

На працягу 26 лютага на Пскоўскім напрамку нашы войскі, прадаўжаючы развіваць наступленне, авалодалі горадам і буйнай чыгуначнай станцыяй Порхаў, раённым цэнтрам Ленінградскай вобласці і чыгуначнай станцыяй Новаселле, а таксама з баямі занялі больш 100 другіх населёных пунктаў.

На захад і на паўднёвы-захад ад горада Холм нашы войскі з баямі прасоўваліся ўперад і авалодалі раённым цэнтрам Калінінскай вобласці і буйнай чыгуначнай станцыяй Локня, а таксама з баямі занялі больш 150 другіх населёных пунктаў. Нашымі войскамі поўнасцю ачышчана ад праціўніка чыгунка Дно—Новасакольнікі.

# СХОД АБЛАСНОГА ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА

25 і 26 лютага праходзіў сход партыйнага актыва Віцебскай вобласці. Комуністы абмяркоўвалі важнейшае пытанне—аб чарговых задачах абласной партыйнай арганізацыі.

Сход адкрыў сакратар абкома КП(б)Б тав. Стулаў.

Пад бурныя,доўга незмаўкаемыя апладысменты ўсіх прысутных у ганаровы прэзідыум выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышом Сталіным.

З дакладам аб чарговых задачах абласной партарганізацыі выступіў таварыш Стулаў.

Ён расказаў аб той гераічнай барацьбе, якую вядзе наша доблесная Чырвоная Армія, вызваляючы ад акупантаў совецкія раёны, у тым ліку тэрыторыю Беларусі і нашай вобласці.

Адстойваючы чэсць і свабоду совецкага народа,—гаворыць т.Стулаў,--разам з народам усяго Совецкага Саюза мужна змагаюцца з лютым ворагам—нямецкімі бандытамі—верныя сыны беларускага народа.

У акупіраванай Беларусі з нябачанай сілай разгарнуўся ўсенародны партызанскі рух. На працягу ўсёй вайны доблесныя партызаны і партызанкі разбураюць тыл ворага, наносяць моцныя ўдары па яго камунікацыях, бязлітасна знішчаюць варожую тэхніку і сілу праціўніка, громяць гарнізоны.

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі вобласці былі створаны сотні партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп, дзесяткі буйнейшых партызанскіх злучэнняў.

Партыйная арганізацыя вобласці нядрэнна справілася з пастаўленай таварышом Сталіным задачай аб разгортванні партызанскай вайны ў тылу ворага. Многія раёны на працягу доўгага часу знаходзіліся пад уладай партызан. Па няпоўных даных, толькі за 1942 і 1943 годы партызанамі забіта 75.743 немцаў, 42.267 ранена, спушчана пад адкос 615 воінскіх эшалонаў, 541 паравоз, знішчаны 101 танк і танкетка, 78 бронемашын, збіта 18 самалётаў, спалена і ўзарвана 123 склады з боепрыпасамі і 171 з прадавольствам, узарвана і разбурана 282 чыгуначных і 783 шасейных масты, знята і пашкоджана 363 км тэлеграфна-тэлефоннай сувязі, узарвана і спалена 1.764 грузавых і легкавых аўтамашыны і 25 трактараў.

У даны момант у нашай вобласці вызвалены ад нямецкіх захватчыкаў поўнасцю два раёны—Мехаўскі і Суражскі—і часткова 6 раёнаў: Полацкі, Расонскі, Сіроцінскі, Гарадоцкі, Лёзненскі і Дубровенскі.

Нямецка-фашысцкія захватчыкі ператварылі нашы вёскі і гарады ў руіны, разбурылі нашу прамысловасць і сельскую гаспадарку. На вызваленай тэрыторыі вобласці спалена і разбурана звыш 48.818 калгасных двароў. У Янавіцкім, Войтаўскім, Курынскім, Астроўскім і іншых сельсоветах Суражскага раёна не засталося ні адной вёскі, ні аднаго дома. Вялікую шкоду нямецка-фашысцкія захватчыкі нанеслі нашым гарадам: у Гарадку засталося не больш адной трэці будынкаў, у Лёзна—каля 15 процантаў, горад Сураж знішчан поўнасцю. З 384.000 чал. насельніцтва, якое пражывала да вайны на вызваленай тэрыторыі, засталося толькі 71. 999 чалавек.

Фашысцкія мярзотнікі цалкам разбурылі сельскую гаспадарку. За час акупацыі знішчана 784 трактары, 126 камбайнаў, 225 складаных малатарань і г. д.

У сувязі з такімі разбурэннямі важнейшай задачай усёй нашай партыйнай арганізацыі з'яўляецца хутчэйшае аднаўленне нармальнага жыцця ў вызваленых раёнах. „Нам неабходна поўнасцю ліквідаваць вынікі гаспадарання немцаў у раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі.Гэта вялікая агульнанародная задача. Мы можам і павінны рашыць гэту цяжкую задачу ў кароткі тэрмін" (Сталін).

У гэтым напрамку намі праароблена ўжо некаторая работа.На вызваленай тэрыторыі ўноў аднаўляюцца 533 калгасы, якія еднаюць 18.792 гаспадаркі. У 487 калгасах выбраны праўленні, якія правялі ўлік грамадскай маёмасці, абагулілі 1177 коней, 382 галавы буйнай рагатай жывёлы, законтрактавана ў калгаснікаў 323 галавы цялят. Ва ўсіх калгасах праводзіцца зараз збор і рамонт сельскагаспадарчага інвентару, збруі, ствараюцца насенныя фонды. Засыпана ўжо ў насенны фонд 8224 ц. зерневых культур, 362 ц. ільну, 15.976 ц. бульбы.

У калгасах адноўлена 53 кузні, створаны і працуюць 246 будаўнічых брыгад, якія пабудавалі ўжо 127 новых і аднавілі 717 поўразбураных дамоў. Але аднаўленне сельскай гаспадаркі ідзе яшчэ надзвычай павольна. Нашы раённыя советы і райкомы партыі не перабудавалі яшчэ цалкам сваёй работы на ваенны лад. Так у Суражскім раёне вельмі дрэнна клапоцяцца аб захаванні конскага пагалоўя. Па Гарадоцкаму, Суражскаму і Мехаўскаму раёнах нездавальняюча праходзіць засыпка насення. Дырэктар Межанскай МТС т. Зозылеў да гэтага часу не прыступіў да рамонта трактароў, дрэнна працуюць нашы загатавіцельныя арганізацыі і райупаўнаркамзагі.

Яшчэ да гэтага часу не разгарнулі па сапраўднаму сваёй работы такія паліт-установы, як чырвоныя вугалкі, хаты-чытальні, клубы, кіно. Неабходна больш увагі ўдзяляць справе аднаўлення народнай асветы. На 15 лютага адноўлены і працуюць толькі 136 пачатковых і 10 НСШ, якія яшчэ не зусім забяспечаны падручнікамі і школьнымі прыладамі. Партыйныя і комсамольскія арганізацыі павінны ўдзяляць больш увагі выхаванню падрастаючага пакалення.

Заканчваючы свой даклад, тав. Стулаў выказаў упэўненасць у тым, што парт-арганізацыя з усімі пастаўленымі перад ёю задачамі справіцца з чэсцю.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўлёныя спрэчкі. Выступаўшыя таварышы—кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый—поўнасцю абрысавалі тое становішча, у якім знаходзяцца зараз вызваленыя раёны. Усяго выступіла 20 чалавек.

Першаму--слова прадастаўляецца старшыні Райвыканкома Суражскага раёна тав. Райцаву. Ён расказаў аб тым, як большэвікі Суражчыны аднаўляюць гаспадарку свайго раёна. Па раёну ўзята на ўлік 1559 сем'яў ваеннаслужачых і партызан, якім ужо аказана дзяржаўная дапамога матэрыяльнымі сродкамі. За тры месяцы выплачана больш 110 тысяч рублёў грашыма, выдана многа хлеба і прамысловых тавараў. Па раёну адноўлена 114 калгасаў з 2320 дварамі. Да 113 калгасаў даведзен ужо план сяўбы на плошчы ў 2861 гектар зерневых. Калгасамі засыпана 504 ц. зерневых, 34 цэнтнеры тэхнічных культур, 150 ц. бульбы. У раёне арганізавана кантрольна-насенная лабараторыя, праз якую прапускаюцца пробы калгаснага насення. Працуе 6 кузняў, дзе адрамантавана 18 параконных і 84 аднаконных плугі. Смалакуранай арцеллю раёна выгнана 250 кг. дзегцю і выпушчана 2,5 тоны драўнянага вугалю.

Слова прадастаўляецца сакратару Расонскага РК КП(б)Б тав. Васілевічу. У сваім выступленні ён расказаў аб тым, што па шасці вызваленых сельсоветах адноўлена 35 калгасаў. Для абслугоўвання насельніцтва арганізаваны і працуюць 8 абутковых і 12 партняжных арцеляў. Вялікую ўвагу ў сваім выступленні ён удзяляе падрыхтоўцы да вясны. На сёнешні дзень па раёну засыпана 38 проц. зерневых, 66 проц. бабовых, 10 проц. ільну і 202 проц. грэчкі. У калгасах працуюць 39 будаўнічых брыгад, якімі ўжо адбудавана 12 зрубаў і 13 канчаюцца будаўніцтвам.

Затым выступае сакратар Гарадоцкага РК КП(б)Б тав. Рэзнікаў.Ён гаворыць аб нябачаных злачынствах фашысцкіх мярзотнікаў у Гарадоцкім раёне. З 48 тысяч насельніцтва засталося ўсяго толькі 20 тысяч чалавек. 6 тысяч лепшых людзей раёна замучылі, расстралялі і спалілі фашысцкія каты. Цалкам разбурана МТС і МТМ. Зараз па раёну адноўлены 93 калгасы, працуюць тры млыны, ганчарная арцель, 2 смалакуркі, 2 бандарных арцелі, цагельны завод, 31 школа, дзе займаецца 2100 дзяцей, арганізавана 5 больніц, амбулаторыя, 9 фэльчарскіх пунктаў, 450 лазняў.

Па раёну засыпана ўжо 10850 цэнтнераў насення. Адрамантавана 7 мастоў да трактараў. Працуе 7 кузніц, дзе рамантуецца сельгасінвентар.

Облваенком падпалкоўнік Сбітнеў гаворыць аб рабоце пунктаў усевобуча, аднačасова ўказваючы на тое, што важнейшай справе ваеннага выхавання совецкіх грамадзян—яшчэ недастаткова ўдзяляецца ўвагі з боку мясцовых партыйных і комсамольскіх арганізацый.

У цяжкіх умовах пачалося аднаўленне Чырвонаармейскай МТС. Аб гэтым гаворыць дырэктар МТС тав. Дзерабін. Пачалі яны з таго, што сцягнулі і даставілі на месца МТС 35 трактараў, якія знаходзіліся на адлегласці 8 кілометраў. Вялікую работу правялі тут комуністы і комсамольцы. Заражаючы ўсіх астатніх сваім прыкладам, яны вазілі на саначках, насілі на руках часткі да трактараў, збіралі іх і рамантавалі.

Хутка была абсталявана кузня. Маторы ўстаноўлены на рамы. Пачаўся інтэнсіўны рамонт. Зараз амаль усе трактары гатовы да работы.

Загадчык абласнога аддзела аховы народнага здароўя тав. Дзенісава расказала аб тым, што на вызваленай тэрыторыі адкрыта 17 больніц на 1500 коек. Больніцы пабудаваны ў Стасенках на 48 коек, у Янавічах—на 30 коек. Пабудавана больніца ў Дуброўна. Медыцынскімі работнікамі прыняты ўсе меры да таго, каб не дапусціць распаўсюджвання эпідэмічных захворванняў. Для гэтага ў кожным населёным пунцке адкрываюцца лазні, арганізуюцца медыцынскія і фэльчарскія пункты. Заканчваючы сваё выступленне, тав. Дзенісава заварае ўвагу на стварэнні пры калгасах дзіцячых ясляў і пляцовак, каб даць магчымасць калгасніцам бесперашкодна працаваць у часе палявых работ.

Сакратар Мехаўскага РК КП(б)Б тав. Волкаў паведаміў аб аднаўленні ў раёне 100 калгасаў. Па раёну адноўлена 47 школ, у якіх навучаецца 2590 вучняў. Працуе 3 ветлячэбніцы, тры МТС, 18 кузніц. Адрамантаваны ўжо 91 параконных і 57 аднаконных плугоў, 577 барон, 187 павозак. Калгасамі засыпана 14 проц. насення.

Сакратар Абкома ЛКСМБ тав. Чэранок гаворыць аб велізарнай ролі сыноў і дачок ленінска - сталінскага комсамола ў барацьбе з нямецкімі акупантамі і ў часе аднаўлення новага жыцця. У 98 калгасах вобласці створаны пярвічныя комсамольскія арганізацыі. Але гэтага недастаткова. Трэба, каб комсамольскія арганізацыі былі ў кожным калгасе. У комсамол трэба ўцягнуць лепшую, перадавую моладзь, якая паказала і паказвае ўзоры барацьбы з нямецкімі акупантамі і зараз з большэвіцкім энтузіязмам уключылася ў аднаўленне разбуранай акупантамі гаспадаркі.

Слова прадастаўляецца сакратару абкома КП(б)Б тав. Жыляніну. Ён заварае ўвагу на падрыхтоўцы калгасаў да веснавой сяўбы, прыводзіць лічбы засыпкі насення па раёнах і заклікае ўзмацніць увагу парт-арганізацый да гэтага пытання.

Характэрна выступленне сакратара партарганізацыі аддзялення Заходняй чыгункі тав. Голубева. Ён расказаў аб тым, як совецкія чыгуначнікі аднаўляюць разбураную немцамі чыгуначную гаспадарку. На чыгунцы шырока разгорнута соцспаборніцтва. Створаны курсы, якія рыхтуюць дастойныя кадры.

Слова атрымлівае старшыня Облвыканкома тав. Рабцаў. Ён гаворыць аб велізарнай ролі і задачах советаў, якія ўскладзены на іх Айчыннай вайной. З 84 старшынь сельсоветаў толькі 24 таварышы працавалі на гэтай рабоце раней, а астатнія прышлі да кіруючай работы ўпершыню. Ім патрэбна максімальная дапамога з боку кіруючых партыйных арганізацый. Пры сельскіх советах неабходна зараз-жа ва ўсю шырыню разгарнуць работу пастаянных камісій. Смялей вылучаць на кіруючую работу жанчын. Каб заваяваць павагу і аўтарытэт сярод працоўных мас, мясцовыя советы павінны чутка прыслухоўвацца да ўсіх патрэб працоўных, неадкладна разглядаць паступаючыя скаргі і прымаць па іх адпаведныя рашэнні. Асабліва вялікая работа сельскім советам прадстаіць зараз, у часе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Яны павінны мабілізаваць усё насельніцтва на хутчэйшую засыпку насенных фондаў, рамонт сельгасінвентара. Кожнаму калгасу неабходна даць план аднаўленчых работ, указаць ім лес для будаўніцтва. Толькі агульнымі намаганнямі партыйных і непартыйных большэвікоў нашай вобласці мы хутчэй адновім нашу прамысловасць і сельскую гаспадарку, хутчэй залечым нанесеныя нам нямецкімі акупантамі раны.

На сходзе прынята разгорнутае рашэнне, накіраванае на хутчэйшае аднаўленне народнай гаспадаркі нашай вобласці.

Удзельнікі схода паслалі прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну, а таксама Цэнтральнаму Камітэту Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі.

Т. РЫМАР.

Адказны рэдактар
А. КРУШЫНСКІ.